**КАНВЕРСІЯ** (лац. conversio ‘змяненне, пераўтварэнне’) 1. У граматыцы: спосаб выражэння суб’ектна-аб’ектных адносін супрацьлеглай скіраванасці (ад аднаго ўдзельніка сітуацыі да другога і наадварот) у эквівалентных па сэнсе выказваннях. К. праяўляецца ў канструкцыях з дзеясловамі незалежнага і залежнага стану і выражаецца формамі аднаго і таго слова: *муляр кладзе камяні – камяні кладуцца мулярам, касір лічыць грошы – грошы лічацца касірам, старшыня ўручыў удзельнікам прэміі – прэміі ўручаны ўдзельнікам старшынёй*. 2. У словаўтварэнні: бязафіксны спосаб дэрывацыі, пры якім адбываецца пераход слова з аднаго лексіка-граматычнага класа ў другі. У беларускай мове К. прадстаўлена субстантывацыяй (пераход іншых часцін мовы ў назоўнікі: *люты, ляснічы, дыпломная*), ад’ектывацыяй (пераход іншых часцін мовы ў прыметнікі: *апалае лісце, пачатая праграма, заварaны чай*), адвербіялізацыяй (пераход іншых часцін мовы ў прыслоўі: *удзень, ноччу, зверху*), пранаміналізацыяй (пераход іншых часцін мовы ў займеннікі: *пра гэта мне паведаміў адзін знаёмы, пры наступных умовах*). Канверсіяй таксама называецца спосаб утварэння новых слоў шляхам змянення парадыгмы слова (*ліс – ліса, кум – кума*). 3. У лексіцы: адносіны паміж дзвюма лексемамі (канверсівамі), якія называюць адну і тую ж рэалію з розных бакоў або абазначаюць процілегла скіраваныя дзеянні, прыкметы, характарыстыкі (*вучні здаюць экзамен настаўніку – настаўнік прымае экзамен у вучняў*).

*Д.В.Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ